Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



# «Гучала слова баявое»




**Трэцяга ліпеня наша рэспубліка будзе адзначаць 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да гэтай даты ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы (ЦНБ) імя Я.Коласа НАН Беларусі праводзіцца шэраг мерапрыемстваў.**

Так, 7 мая ў бібліятэцы адбылася літаратурна-музычная вечарына «Дарогамі вайны» *(гл. «Веды» ад 19.05.2014 г., №20)*. У рамках святочнай праграмы аддзелам рэдкіх кніг і рукапісаў падрыхтавана выстава «Беларусь партызанская», дзе былі прэзентаваны кніжныя выданні з серыі «Бібліятэка маладога партызана» і «Героі Айчынай вайны», а таксама з асабістай бібліятэкі кіраўніка падпольных абкамаў і райкамаў ЦК КП(б) Беларусі П.Панамарэнкі.

ЦНБ удзельнічала ў сумесным мерапрыемстве з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі – Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь: памятнае лета 1944 года.Тут праходзіла пасяджэнне секцый «Нацистский оккупационный режим. Партизанское движение и подпольная борьба на оккупированной территории Беларуси» і «Беларусь в системе международных отношений. Восстановление народного хозяйства БССР». Да гэтага мерапрыемства аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў падрыхтаваў дзве выставы «Нацистский оккупационный режим. Партизанское движение и подпольная борьба на оккупированной территории Беларуси» і «Пером и штыком приближали Победу».

Дэманстраваліся дакументы часоў Вялікай Айчыннай вайны, якія захоўваюцца ў архівах рукапіснага сектара аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. Удзельнікі канферэнцыі азнаёміліся з матэрыяламі асабістых архіваў беларускіх пісьменнікаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны – К.Крапівы, П.Глебкі, П.Панчанкі, М.Лужаніна, А.Вялюгіна, Я.Брыля, П.Пестрака, М.Машары. Гэта творы пісьменнікаў ваеннага часу ў рукапісным варыянце, іх франтавыя лісты, пасведчанні, даведкі, баявыя характарыстыкі і інш.

Вялікую цікавасць удзельнікаў канферэнцыі выклікалі матэрыялы пра падпольшчыкаў і партызан, у тым ліку рэдкія фотаздымкі і замалёўкі самадзейных мастакоў. Сярод унікальных дакументаў былі прадстаўлены акты пра зверствы фашыстаў, дакументы нямецкіх акупацыйных уладаў і карты часоў нямецкай акупацыі гарадоў Мінска і Лунінца. На выставах шырока дэманстравалася падпольная і партызанская прэса ў выглядзе газет, баявых лісткоў, лістовак, заклікаў.

**Алена ДЗЕНІСЕНКА,**
**Таццяна ЖУК,**
**Вольга ГУБАНАВА,**
**Валерыя НАВУМЕНКА,**

**аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў**
**ЦНБ НАН Беларусі**

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by